■ Блізкая ўлада

# ГРАМАДСКІЯ ІНТАРЭСЫ — ВЫШЭЙ ЗА АСАБІСТЫЯ



## ПРА ГЭТА СВЕДЧАЦЬ ЗВАРОТЫ ГРАМАДЗЯН НА «ПРАМЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ ЛІНІІ»

**Больш як 30 званкоў паступіла на «прамую лінію», што правёў намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар СІРЭНКА. Як правіла, усе заяўнікі адразу, нават не прадставіўшыся як след, вельмі эмацыйна пачыналі аповед пра свае цяжкасці, прасілі дапамогі, кансультацыі. Віктар Іванавіч іх перапыняў, цярпліва ўдакладняў прозвішча, адрас, прасіў больш дакладна сфармуляваць сутнасць праблемы. Колькі людзей, якім патрэбна дапамога, праз гэта не маглі дазваніцца», — з жалем канстатаваў ён.**

Віктар Сірэнка правёў з пачатку года не адну «прамую тэлефонную лінію», таму ўпэўнена сцвярджае, што ў працэнтных суадносінах за гэты час тэматыка зваротаў грамадзян практычна не памянялася. Асноўныя — асфальтаванне і рамонт дарог, водазабеспячэнне, прыватызацыя жылля, правільнасць налічэння пенсій, камунальна-бытавыя паслугі. Часам людзі звяртаюцца паўторна. І ў гэтым, на яго думку, вінавата мясцовае кіраўніцтва, якое фармальна падышло да даручэння Мінаблвыканкама, не разабралася належным чынам у сітуацыі.

У прыватнасці, Пётр Аніськоў з вёскі Гусгалаўка Мінскага раёна патэлефанаваў на «прамую лінію» ў другі раз. Праз населены пункт праходзіць дарога, якая злучае дзве трасы — М1 і М4. Гэты ўчастак шляху трэба было б заасфальтаваць, паколькі ім карыстаецца Мінская агароднінная фабрыка. На першы запыт заяўніку адказалі, што сёлета планам асфальтаванне не прадугледжана. «Дайце адказ, у якім годзе яго ўключаць у план», — прасіў мужчына. Віктар Сірэнка паабяцаў, што яму пра гэта афіцыйна паведамяць.

— Людзі павінны быць інфармаваныя па асноўных пытаннях: чаргавасці і ходзе будаўніцтва водаправода, асфальтавання дарог у населеных пунктах, рамонту дамоў, газіфікацыі. Планы павінны быць адкрытымі і даступнымі для ўсіх, а іх рэалізацыя мясцовымі ўладамі павінна быць на кантролі насельніцтва, — лічыць Віктар Сірэнка.

Падчас тэлефанаванняў людзі, як правіла, падымалі сацыяльна значныя пытанні, што тычацца матэрыяльнага дабрабыту, павышэння ўзроўню жыцця ўсіх жыхароў населенага пункта.

Напрыклад, Віктар Бакуноў з Заслаўя адразу папярэдзіў, што ён клапоціцца найперш аб грамадскіх інтарэсах. Мужчына прасіў дапамогі ў вырашэнні цэлага комплексу праблем: ахова здароўя, добраўпарадкавання, забеспячэння чыстай вадой, арганізацыі маршрутнага таксі да Бараўлян. Акрамя таго, як сказаў заяўнік, жыхароў хвалюе, што ў Заслаўі закрылі пашпартны стол. І цяпер па любую драбязу, у прыватнасці памяняць пашпарт ці паставіць у ім штамп, даводзіцца ехаць у Мінск, марнаваць час. Цікавіўся ён і будаўніцтвам новай паліклінікі. Віктар Сірэнка адказаў, што будаўніцтва такой медыцынскай установы ў горадзе не плануецца. Затое дзеючая будзе пашырана: сёлета пачнецца ўзвядзенне прыбудовы да яе. На астатнія пытанні заяўнік атрымае адказ адпаведных службаў, куды будуць накіраваны запыты.

Юлія Сяргееўна жыве ў адной з вёсак Сталінскага раёна, што на Брэстчыне. Звярнуцца на «прамую лінію» яе прымусіла крыўда на кіраўніцтва прыватнай сельгаскампаніі, што знаходзіцца ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. Як паведаміла жанчына, яна і яшчэ пяць яе землякоў цэлы месяц палолі цыбулю на палях гэтай фірмы. З імі быў заключаны дагавор. Па заканчэнні тэрміну яго дзеяння ім не далі на подпіс акт выкананых работ, не разлічыліся: абяцалі выслаць дакумент, як і грошы, па адрасе пражывання. Але замест гэтага работнікі атрымалі па пошце... незапоўнены бланк акта на подпіс. Тэлефанавалі, каб ім вярнулі заробленае, але там не здымаюць трубку.

Віктар Іванавіч параіў Юліі Сяргееўне звярнуцца ў пракуратуру з афіцыйнай заявай. Калі няма часу прыехаць у райцэнтр, то можна даслаць ліст па электроннай пошце або заказным пісьмом. Акрамя таго, кіраўніцтву Стаўбцоўскага раёна будзе накіравана пісьмо з даручэннем разабрацца ў сітуацыі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**




Паводле даных Мінсельгасхарча, уборачная кампанія набліжаецца да завяршэння — у рэспубліцы ўбрана ўжо каля 97 працэнтаў плошчаў. Усяго 0,5 тыс. га трэба ўбраць гаспадаркам Брэсцкай вобласці, не ўбралі яшчэ 1,1 тыс. га ў Гомельскай вобласці, 1,7 тыс. га — у Магілёўскай, 9,8 тыс. га — у Гродзенскай, 12,3 тыс. га — у Мінскай, 47,8 тыс. т — у Віцебскай вобласці. Усяго ў гэтым годзе пад збожжавыя і зернебабовыя адведзена 2 млн 184,6 тыс. га. У сярэднім з 1 га аграрыі ўбіраюць 39,2 ц збожжа — усяго на 0,1 ц менш, чым у 2014 годзе.

## НА СУВЯЗІ



**22 жніўня, у суботу, начальнік Дэпартамента аховы МУС Беларусі генерал-маёр міліцыі Сяргей Мікалаевіч ХАМЕНКА правядзе прамую тэлефонную лінію.** Пытанні, якія тычацца прадастаўляемых дэпартаментам паслуг, іх коштаў, патрабаванняў да кандыдатаў на службу, а таксама іншыя пра дзейнасць службы аховы можна будзе задаць **з 9.00 да 12.00 па тэлефоне: (8-017) 218-55-30.**

■ Не прапусціце!

# ПАЛЯТАЕМ?

**Тым, хто не ўяўляе сваё жыццё без рамантыкі, прыгод і неба, абавязкова трэба прыйсці ў гэтую суботу на аэрадром Нова-Пашкова, што пад Магілёвам.**

Авіяцыйна-спартыўнае свята пачнецца а 10-й гадзіне. У праграме — дэманстрацыйныя палёты авіяцыйнай тэхнікі ваенна-паветранай сілаў і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі, групавыя пілатажы лётчыкаў, скачкі з парашутам з элементамі акрабатыкі ваеннаслужачых і спартсменаў, паказныя заняткі па рукапашным бой спецназаўцаў. Дзецям будзе цікава пабачыць выставу спартыўнай тэхнікі. А дарослым здзейсніць агледныя палёты на самалёце АН-2, верталёце Мі-2, а таксама пастраляць з пнеўматычнай зброі.

Магілёўскі аэраклуб імя А.М. Кулагіна, які такім чынам святкуе сваё 80-годдзе, мае даўнія традыцыі і важкія заслугі перад Радзімай. За гады сваёй дзейнасці ён падрыхтаваў тысячы разраднікаў па авіяцыйных відах спорту, 64 майстроў парашутнага, самалётнага і авіямадэльнага спорту, двух майстроў спорту міжнароднага класа, заслужанага майстра спорту. Сярод тых, хто мужна змагаўся ў небе ў гады Вялікай Айчыннай вайны, чацвёра Герояў Савецкага Саюза. Гэта былыя выхаванцы магілёўскага аэраклуба Андрэй Кулагін (імя якога носіць аэраклуб), Міхаіл Лусто, Ціхан Жучкоў, Георгій Надтачэеў. Ужо пасля вайны ганаровае званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна атрымаў Андрэй Мельнікаў, які загінуў падчас выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Яшчэ адзін выхаванец аэраклуба Ігар Уразаеў стаў Героем Расіі за праяўленую мужнасць і прафесійнае вядзенне бою падчас баявых дзеянняў у Чачні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ТУНІС АДМЯНІЎ ВІЗЫ ДЛЯ ГРАМАДЗЯН НАШАЙ КРАІНЫ

**Урад Туніса прыняў рашэнне аб адмене ўязных віз для грамадзян Беларусі. Гэтую інфармацыю, раней распаўсюджаную турыстычнымі агенцтвамі, пацвердзіў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

— Знаходжанне на тэрыторыі Туніса не павінна перавышаць 90 сутак, — паведаміў прадстаўнік МЗС. — Для ўезду грамадзяне нашай краіны павінны мець пашпарты і праязныя дакументы.

Ён таксама прызнаўся, што наша знешнепалітычнае ведамства вітае дадзенае рашэнне туніскага боку.



— Адначасова неабходна звярнуць увагу на тое, што ў Тунісе яшчэ не адменены рэжым надзвычайнага становішча, уведзены пасля двух рэзанансных тэрактаў, — папярэдзіў Дзмітрый Міронычк. — Туніскія ўлады і ваенныя прымаюць меры па забеспячэнні бяспекі замежных турыстаў у курортных зонах. Тэрарыстычная пагроза ў краіне захоўваецца, 100-працэнтнай гарантыі бяспекі замежных грамадзян няма.

Нагадаем, 30 чэрвеня ў сувязі з тэрактам у Тунісе МЗС рэкамендавала беларускім грамадзянам, якія знаходзяцца ў гэтай краіне, выконваць максімальна магчымыя меры засцярогі і ўстрымацца ад наведвання месцаў масавага збору людзей. Гэтыя рэкамендацыі застаюцца ў сіле.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## ПЕРАХОДЫ БУДУЦЬ ПАД ПІЛЬНАЙ УВАГАЙ

**Напярэдадні навучальнага года сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмацніла кантроль за захаваннем кіроўцамі правіл праезду пешаходных пераходаў. Мерапрыемствы будуць доўжыцца да 26 жніўня.**

— У гэты перыяд увесь асабовы склад дарожнай міліцыі будзе патруляваць напружаныя ўчасткі дарог: нарады ДПС набліжаны да аварыйна-небяспечных пешаходных пераходаў, — гаворыць **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Інспектары ДАІ выпраўляцца ў працоўныя калектывы прадпрыемстваў і аўтагаспадарак горада, вучэбныя ўстановы і аўташколы, каб нагадаць усім удзельнікам дарожнага руху правілы бяспечных паводзін пры пераходзе праезнай часткі і праездзе пешаходных пераходаў.

За парушэнне правілаў праезду апошніх прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да пяці базавых велічынь. У выпадку паўторнага падобнага парушэння цягам года штраф павялічваецца да васьмі базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## БЕНЕДЫКТ XVI АХВЯРАВАЎ НА ДАБРАЧЫННАСЦЬ СВАЕ ЧАРАВІКІ

У Германіі сёлета адзначаецца 150-я гадавіна з дня смерці вядомага нямецкага святара, рэлігійнага дзеяча, шаўца Адольфа Кольпінга, і адрасатам славутых пантофляў папы на пенсіі стаў дабрачынны фонд "Кольпінгверк". Дар папы мусіць распачаць кампанію "Мой абутак робіць добра!". У яе межах жыхары Кёльна паспрабуюць сабраць 15 тысяч пар абутку.

**Якаў ЖУРБІН.**

## ЗААПАРК, ДЗЕ МОЖНА ПАГЛАДЗІЦЬ ЗВЕРА

**Першы ў сталіцы кантактны заапарк, у якім жывёл можна будзе гладзіць, карміць і расчэсваць, абяцаюць адкрыць 22 жніўня ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «Тытан» падчас Фестывалю ўсёзнайкі.**

Кантактны заапарк сеткі «Краіна Яноція» зойме плошчу каля 300 квадратных метраў. У ім будуць прадстаўлены дзясяткі відаў звяроў і птушак, у тым ліку поні, камерунская каза і аленяня. У якасці «фірменнай» жывёлы абраны яноты — насухі і паласкуны. У заапарку будзе працаваць аніматар, а развіваць у дзіцяці таленты прапануюць у зоне дзіцячай творчасці. Для маленькіх наведвальнікаў арганізуюць майстар-класы, падчас якіх навучаць у тым ліку плесці бранзалеты, рабіць дробныя вырабы і правільна маляваць звяроў. У дзень адкрыцця трапіць у кантактны заапарк можна будзе за паўцаны.

На Фестывалі ўсёзнайкі, які прымеркаваны да Дня ведаў, будзе працаваць імправізаваная школа. Вядучы ў ролі вясёлага настаўніка правядзе ўрокі геаграфіі, біялогіі, выяўленчага мастацтва і фізкультуры. Напрыклад, будучым біёлагам прапануюць перадаць галасам гукі розных жывёл, а на ўроку музыкі трэба будзе



ўгадаць мелодыю. Таксама чакаюцца кулінарнае шоу і выступленне юных артыстаў. Апроч гэтага, у гандлёвым цэнтры пройдзе распродаж дзіцячых тавараў. Зніжкі на цацкі, адзенне і школьныя прыналежнасці абяцаюць да 50 працэнтаў. Уваход на фестываль вольны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## СМОГ НАД БРЭСТАМ

**Яшчэ ў сераду раніцай Брэст прачнуўся ў лёгкім смогу. У чацвер едкі пах адчуўся над горадам яшчэ больш. Як патлумачыў спецыяліст абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Юрый КАЛЯДА, ужо два тыдні на тэрыторыі Украіны, фактычна на мяжы з Маларыцкім раёнам, гараць тарфянікі. 18 жніўня напрамак ветру перамяніўся, падзьмула ў наш бок. Вось непрыемны пах і дайшоў да Брэста.**

Як паведамілі ў абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і аховы грамадскага здароўя, вядзецца маніторынг павета на тэрыторыі населеных пунктаў на ўтрыманне прадуктаў гарэння: аксіду вугляроду, вокісу азоту і іншых. Пакуль што перавышэння дапусцімых канцэнтрацый указаных рэчываў не выяўлена. Але ж дыхаць ў Брэсце становіцца ўсё цяжэй.

Яшчэ горш даводзіцца жыхарам Маларыты і памежных вёсак. **Рэдактар маларыцкай раённай газеты «Голас часу» Ніна СВІЦЮК** сказала, што ў райцэнтры ўжо наогул вокны адкрыць нельга. І калі днём ветрык крыху разганяе смурод, то ноччу пах торфу, які гарыць, асабліва дакучае. Застаецца спадзявацца толькі на дажджы, якіх сіноптыкі пакуль, на жаль, не абяцаюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** yackevich@zviazda.by